# ПАЦЫФІСЦКІЯ МАТЫВЫ Ў ВЕРШАХ ВІКТАРА ШЫМУКА

Максімовіч К.У.
Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт, Беларусь
Кафедра сацыяльна-гуманітарных навук
Навуковы кіраўнік – к.г.н., дацэнт Сільвановіч С.А.

**Актуальнасць** тэмы абумоўлена тым, што ў наш неспакойны, насычаны ваеннымі канфліктамі час, ёсць настойлівая патрэба ў пацыфісцкіх настроях і сродках, у тым ліку мастацкіх, іх фарміравання. Аб’ектам даследавання з’яўляецца творчасць пладавітага, але малавядомага паэта з Дзятлаўшчыны Віктара Шымука.

**Мэта работы**: выявіць вершы, у якіх гучаць пацыфісцкія матывы, і паэтычныя сродкі, з дапамогай якіх Віктар Шымук іх выразіў.

**Задачы даследавання**: 1) сістэматызаваць вершы Віктара Шымука, прысвечаныя ваеннай тэме; 2) прааналізаваць вершы, у якіх прысутнічаюць пацыфісцкія матывы; 3) выявіць паэтычныя сродкі, з дапамогай якіх выражаюцца пацыфісцкія настроі.

**Метады**: аналіз, сінтэз, сістэматызацыя і апісанне.

**Рэзультаты і выводы.** Аналіз вершаў Віктара Шымука дазваляе сцвярджаць, што найбольш дзейсным спосабам фарміравання пацыфісцкіх настрояў для яго з’яўляецца пастаяннае нагадванне людзям аб жахах мінулай вайны. Па глыбокаму перакананні Віктара Шымука той, хто бачыў вайну, перажыў яе жахі, прыложыць усе свае намаганні, каб вайна больш ніколі не паўтарылася. В.Шымук шмат ездзіў па Еўропе ў складзе творчых дэлегацый, шмат бачыў помнікаў ваенных часоў. І ўсюды, дзе б ён ні быў, узнікала думка аб немагчымасці дапусціць вайну. Былі часы напружаных адносін з ЗША, была атмасфера так званай “халоднай вайны”, быў  В’етнам. І заўсёды Віктар Мікалаевіч выступае як праціўнік вайны, як шчыры пацыфіст. Такім мы бачым яго ў вершы “Франтавыя сяброўкі”. Дзеючыя асобы верша  - ветэраны, якія перажылі вайну і захавалі памяць пра яе  на доўгія гады. Менавіта да іх звяртаецца паэт. Нават дрэвам, што растуць вакол паляны, давялося вынесці неверагоднае, што ж тады казаць пра людзей, якія прайшлі агонь франтоў, смерць, пекла бамбёжак і артылерыйскіх абстрэлаў. Галовы пакрыліся сівізной, пастарэлі целы, згорбіліся спіны, але сэрцы ў ветэранаў засталіся маладымі. І міжволі ўзнікае думка, якая не магла не ўзнікнуць, думка аб немагчымасці вайны для ўнукаў і праўнукаў, бо мір заваяваны вельмі вялікім коштам. Такім пачуццём прасякнуты і верш паэта “Неспакойна на сэрцы”. Ён прысвечаны вайне ва В’етнаме. Гэта вайна прыгадала Віктару Мікалаевічу яго крывавае дзяцінства, яго страхі і адчай.  І паралельна паэт паказвае сваё дзяцінства. Гэта паралель дазваляе адчуць глыбокую духоўную еднасць усіх людзей на свеце, усіх мацярок і дзяцей, а яшчэ адчуць, якая жудасная з’ява вайна. Як чалавек і паэт, Віктар Шымук звярнуўся вершам “Неспакойна на сэрцы” да ўсіх суайчыннікаў, беларусаў, да ўсіх людзей добрай волі:”Зберажыце мір, не дапусціце новых войнаў на зямлі.” Верш Віктара Шымука дынамічны, эмацыянальны, насычаны экспрэсіўна афарбаванымі словамі, якія дапамагаюць пранікнуцца пачуццём нянавісці да тых, хто распачынае войны на Зямлі (крывавы ранак; навокал гарэла, смылела; я крычаў, галасіў ашалела; крывавае лета; шэпчуць губы засмяглыя). Аптымізм, вялікая вера ў розум людзей гучыць у вершах В.Шымука “Франтавыя сяброўкі” і “Неспакойна на сэрцы”. Паэт хоча перадаць гэту веру кожнаму з нас, хоча запаліць у нашых душах агеньчык чалавечнасці, спачувальнасці, неабыякавасці да таго, што адбываецца ў свеце, бо Зямля - наш агульны дом, і ад таго, як будзем мы пра яго клапаціцца, залежыць наша будычыня, будучыня нашых дзяцей і ўнукаў.

**Літаратура:**

1. Шымук, В.М. Святло красавіцкіх бяроз // В.М. Шымук. – Мн.: Мастацкая літаратура,1983. – 158 с.

2. Шымук, В.М. Спелы жнівень // В.М. Шымук. – Мн.: Мастацкая літаратура,1990. – 143 с.

Рэпазіторый ГрДМУ